ФОРУМ

# ФОРМА ВАДЫ



**Вадалазы шукаюць не толькі скарбы. Яны таксама ратуюць людзей, калі гэта вадалазы МНС. Ім не вельмі падабаецца, калі іх называюць дайверамі. Гэтыя хлопцы не любуюцца прыгажосцю падводнага свету, а выконваюць нялёгкую работу — ратуюць тапельцаў, здабываюць з вады патанулую тэхніку, абследуюць гідратэхнічныя збудаванні, праводзяць пошукі пацярпелых і прадметаў на дне нашых рэк і азёр.**

**Ілья КРАСОЎСКІ,**
**«Р» за 14 ліпеня**

— Вадалазам-ратавальнікам ставіла б помнікі пры жыцці. Хоць, як мне здаецца, страшная ў іх праца — мала на што наткнешся пад вадой. Гэта ж якія нервы трэба мець! Хлопцы мала таго, што ратуюць іншых, дык яшчэ і цяжкае абсталяванне на сабе цягаюць. Камплект мокрага вадалазнага рыштунку важыць каля 30 кілаграмаў. Адным словам, смелыя і мужныя людзі.

**Алена КРУКАВА, Маладзечна**

# РАСКІНУЛІ БЯСПЛАТНЫЯ СЕТКІ

**Мінчане ўжо не жадаюць абмяжоўвацца хатнім варыянтам інтэрнэту. Ім даспадобы гуляць у любімых гульні і перапісвацца ў сацсетках на вуліцы па дарозе на працу ці занятаў. Для іх у горадзе паступова арганізоўваюць усё новыя і новыя кропкі бясплатнага Wi-Fi.**

**Іна ГАРБАЦЕНКА,**
**«Р» за 14 ліпеня**

— З аднаго боку, добра, што мы паспяваем за прагрэсам. З другога — мы настолькі паглыблены ў свае тэлефоны і смартфоны, што хутка перастанем адзін аднаго заўважаць на вуліцы. Людзі ж нічога не бачаць навокал. Ды добра, калі б на прыгажосць не звярталі ўвагі. Але не заўважаюць старых, дзяцей, тых, каму можа спатрэбіцца дапамога.

**Антон БАЯРАЎ, Мінск**

# РАМАН З КАМЕНЕМ



**Беларускі ізумруд. Гучыць дзіўосна і горда. Асабліва калі ведаеш, што самацвет валадарства і багацця, які вырас у лабараторыі навук, вельмі высокай якасці. Аб сіле штучных камянёў расказаў кіраўнік лабараторыі фізікі звышправодных матэрыялаў Навукова-практычнага цэнтра НАН па матэрыялазнаўстве Андрэй Салдатаў.**

**Вольга КАСЯКОВА,**
**«Р» за 14 ліпеня**

— Прыемна, што нашы навукоўцы навучыліся вырошчваць ізумруды ў прабірках. Наўрад ці камень лепшы, чым натуральны, тым больш з Калумбіі. Але дакладна гэта даступная альтэрнатыва для нашых модніц.

**Святлана Анатольеўна, Салігорск**

Зачапіла публікацыя? Ёсць праблема?
Званіце і пішыце нам:
(8-017) 287-15-34; info@respublika.info